Э. В. Арава

ЛЕЎ
МЕЕРАВІЧ
ЛЕЙТМАН

Э. В. Арава

ЛЕЎ МЕЕРАВІЧ ЛЕЙТМАН

Выдавецтва
«Беларусь»
Мінск 1976

75C2
А 79

© Выдавецтва «Беларусь», 1976

А $\frac{80101\text{-}040}{М\ 301(05)\text{-}76}$ 217-75



Леў Мееравіч Лейтман

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Леў Мееравіч Лейтман увайшоў у гісторыю беларускага савецкага мастацтва як тонкі лірык-акварэліст, чулы, улюбёны ў сваю справу педагог.

Амаль паўстагоддзя творчай і 30 гадоў педагагічнай дзейнасці на яго працоўным шляху. Творчасць Л. Лейтмана развівалася ў агульным русле савецкага мастацтва. Яна адлюстравала станаўленне і развіццё нашай дзяржавы: слаўныя будні будаўніцтва сацыялізма, гераічны подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пасляваеннае аднаўленне краіны, шматграннае жыццё чалавека-працаўніка.

Творы Л. Лейтмана ўслаўляюць веліч савецкага чалавека, прыгажосць роднага краю. Розныя па свайму характару, яны заўсёды жыццярадасныя, чалавекалюбівыя. Усё гэта робіць творчасць Льва Мееравіча Лейтмана грамадзянскай і гуманістычнай, неабходнай нашаму сучаснiку.

Леў Мееравіч Лейтман нарадзіўся 23 сакавіка 1896 г. у Петрыкаве, што на Гомельшчыне, у сям'і служачага. Хутка разам з бацькамі пераехаў у Гарадок, што на Віцебшчыне. Тут, сярод прывольнай і паэтычнай беларускай прыроды, прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады будучага мастака. Жыццярадасны, вясёлы, ён любіў пісаць вершы, спяваць і асабліва маляваць.

Жаданне быць мастаком праявілася ў Л. М. Лейтмана ўжо тады. Скончыўшы школу, ён паехаў у Віцебск да вядомага беларускага жывапісца Юрыя Майсеевіча Пэна, чыя майстэрня была адкрыта для ўсіх жадаючых. У Ю. Пэна Леў Мееравіч вучыўся перад першай сусветнай вайной. У 1916 г. займаўся ў школе прафесара Бяршадскага ў Адэсе.

Рэвалюцыю Л. Лейтман сустрэў як найвялікшае здзяйсненне, як новую старонку гісторыі. У той час ён вучыўся на псіханеўралагічным факультэце Петраградскага медыцынскага інстытута. Але не да вучобы было тады. З галавой акунуўся юнак у кругаварот падзей. Сабраў вакол сябе моладзь, чытаў даклады на самыя разнастайныя тэмы — ад палітыкі да пытанняў прыродазнаўства, ставіў спектаклі, пісаў лозунгі і плакаты. З 1918 года Л. Лейтман пачынае выкладаць маляванне ў школе, кіруе выяўленчай студыяй.

Невялікаму, кволаму, але такому энергічнаму, жыццярадаснаму юнаку

Партрэт работніцы віцебскай фабрыкі «КІМ» Францэвіч

Пейзаж ваенных гадоў

вёрылі, прыносілі свае жывапісныя работы, раіліся з ім. Але чаму ён мог навучыць, калі сам больш адчуваў, больш хацеў, чым умеў? Ведаў — вось чаго не хапала Л. Лейтману, каб знайсці сваё месца ў мастацтве. У 1923 годзе ён зноў едзе да Ю. Пэна, які становіцца цяпер для Л. Лейтмана не толькі настаўнікам, але добрым і мудрым старэйшым сябрам. Разам яны хадзілі па вячэрнім Віцебску, любаваліся ім, гаварылі аб асвятленні, кампазіцыі, каларыце, і ўжо тады ў Льва Мееравіча з'явілася жаданне перадаць у сваіх будучых творах паэзію родных мясцін, прымусіць і іншых захапляцца іх прыгажосцю.

Поўнае пошукаў, рашучых эксперыментаў, юнацкай гарачнасці і катэгарычнасці — такім было наша мастацтва, калі ў яго прыйшоў Лейтман. Леў Мееравіч, ахоплены чароўнасцю фарбаў, нічога не абыходзіў увагай.

У станаўленні мастака немалую ролю адыграў Віцебскі мастацкі тэхнікум, дзе Л. Лейтман з 1931 г.— выкладчык, а з 1936 — загадчык навучальнай часткі. Разам з ім працавалі тады вядучыя беларускія мастакі — Ю. Пэн, А. Бразер, С. Юдовін, М. Керзін, В. Волкаў, І. Ахрэмчык, У. Хрусталёў, М. Міхалап. Гэта было актыўнае творчае асяроддзе. Выкладчыкі пастаянна выязджалі на эцюды, экспанавалі свае работы на выстаўках. Працуючы ў тэхнікуме, Леў Мееравіч больш строга і

ўважліва прыглядаўся і да таго, што рабіў сам, і да таго, што рабілі іншыя. Уважліва назіраў жыццё, шмат чытаў. Вучыўся і на лепшых прыкладах, і на памылках, вывучаў вялікіх майстроў. Кім толькі Л. Лейтман не захапляўся! Але больш за ўсё любіў Левітана, Урубеля, Каровіна, Манэ. Прыязнасці гэтай застаўся верны на ўсё жыццё. Яна зрабіла высакароднай палітру мастака, надала вытанчанасць фарбаваму строю яго твораў.

У канцы 20-х гадоў Л. Лейтман удзельнічае ў рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выстаўках: у 1929 г.— у выстаўцы экслібрыса ў Лос-Анджэлесе, у 1930 — у 3-й Усебеларускай выстаўцы ў Мінску, у 1935 — у выстаўцы беларускага мастацтва ў Маскве. Пейзажы гэтага перыяду («Прыстань», «Восень», «Захад на Дзвіне», «Млын», «Канец зімы») напісаны мастаком шчыра, захапляльна, з вялікай любоўю да роднага краю. Партрэты «Ю. М. Пэн», «Стары», «Хлопчык» вельмі ўдала перадаюць унутраны свет чалавека і сведчаць аб непрытоена добрых адносінах аўтара да яго.

У 30-я гг. з асаблівай сілай увагу савецкіх мастакоў прыцягвае бурны рытм жыцця, незвычайны працоўны энтузіязм. Мастакі едуць на новабудоўлі, ідуць у цэхі заводаў. Захапляе індустрыяльная тэма і Л. Лейтмана. Па словах мастака, гэта яму дапамагала глыбей адчуць эпоху, сваіх сучаснікаў. На ўсесаюзнай выстаўцы «Індустрыя

Зімні пейзаж 1943 г.

Зімні вечар

сацыялізма» ў Маскве (1939) Леў Меераві̆ч выставіў серыю работ «Жанчына на вытворчасці», прысвечаную разняволенай жанчыне — тэме, характэрнай для таго часу.

Выбар мастака спыніўся на панчошна-трыкатажнай фабрыцы «КІМ». Убачанае Л. Лейтманам — светлыя, прасторныя цэхі, зладжаны рытм работы машын, энтузіязм работніц — знайшло адбітак у яго лістах, выкананых гуашшу. У гэтых лістах мастака адчуваюцца свабода, лёгкасць, аптымізм, падкрэсліваецца думка, што на вытворчасці самае галоўнае — не машыны, а дзелавітыя, спрытныя людзі. Ліст «Кетлёўшчыца» кампазіцыйна пабудаваны так, што глядач быццам бы сам уцягваецца ў дзеянне. Плаўны, музычны, пазбаўлены аднастайнасці рытм, які перадае рух машын, чысціня і яркасць каларыту, выразныя партрэты — усё гэта стварае карціну энтузіязму, светлых працоўных будняў 30-х гадоў.

У Маскве, як і ў Мінску, гэтыя работы Л. Лейтмана былі высока адзначаны, што абавязвала мастака яшчэ больш патрабавальна адносіцца да сябе, больш увагі ўдзяляць самаадукацыі. Ён актыўна удзельнічае ў выстаўках у Маскве, Англіі, Амерыцы. У гэты ж час Л. Лейтман стварае серыю работ «Жыццё, быт і вучоба Чырвонай Арміі», за якую быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Большая частка лістоў,

Старадаўняя альтанка

створаных непасрэдна з натуры ў Мазурыне пад Віцебскам, загінула ў гады вайны. Але тое, што захавалася («Пантонная пераправа», «Стадыён у Мазурыне»), пераконвае ва ўменні мастака зорка назіраць жыццё, адбіраць у ім найбольш характэрнае, уносіць асаблівую цеплыню і шчырасць ва ўсё, што ён стварае.

Пранікнёнасць і вастрыня ўспрымання ў спалучэнні з майстэрствам каларыстычнага рашэння ўласцівыя пейзажам Л. Лейтмана гэтых гадоў: блакітна-зеленаватай трапяткой «Вясне», якая была прадстаўлена на выстаўцы «Лепшыя творы савецкіх мастакоў» у Маскве (1941); насычанаму вільгаццю, з вялікай прасторай неба і найтанчэйшымі каляровымі нюансамі «Дажджліваму дню»; прывіднаму, з таючымі сілуэтамі «Вечару». Лёгкія блакітныя, ружовыя, зялёныя і дымчатыя тоны гэтых пейзажаў сваёй мяккасцю, гармоніяй сведчаць аб любоўных адносінах аўтара да колераў роднай прыроды.

З задавальненнем піша мастак і партрэты. Мяркуючы па водгуках у тагачасным друку, лепшы з іх — «Дзяўчына ў чорным і блакітным», у якім Лейтману ўдалося перадаць непасрэд-

насць, своеасаблівасць рысаў характару чалавека, яго непаўторнасць.

У канцы 30-х — пачатку 40-х гг. настойлівая праца, удзел у шматлікіх выстаўках прынеслі Л. М. Лейтману прызнанне, вылучылі яго ў лік лепшых акварэлістаў рэспублікі. Перад самай вайной адкрылася яго персанальная выстаўка ў Мінску, дзе выстаўляліся партрэты, пейзажы, нацюрморты, выкананыя ў акварэлі, гуашы, масле («Блакітны дзень», «Ля дарогі», «Спякотны дзень», «Дзяўчына ў касынцы», «Стары мост»). Сярод лепшых прадстаўленых работ — «Зіма», «Канец зімы», «Млын на Віцьбе». Крытыка адзначала ў іх культуру колеру, уменне мастака данесці да гледача лірычны настрой, паэтычнасць і меладычнасць малюнка. Л. Лейтман набыў свой голас...

І раптам вайна. Дзікая, недарэчная, яна разарвала жыццё кожнага на светлае, творчае, цікавае «ўчора» і навальнічнае, суровае «сёння». Кругом былі пажары, руіны. Сэрцы савецкіх людзей палалі нянавісцю да ворага, які прынёс на нашу зямлю смерць, разлуку, гора. І 45-гадовы мастак, у той час дырэктар Віцебскага мастацкага вучылішча, становіцца салдатам, радавым Чырвонай Арміі.

У архіве Л. Лейтмана захаваліся асобныя газеты тых дзён. Старыя дакументы заўсёды выклікаюць хваляванне, а звязаныя з вайной — каго могуць пакінуць абыякавым?.. «У 23 раё-

Мінская ўскраіна

нах Маскоўскай вобласці поўнасцю разбураны 537 вёсак, часткова 928..., 947 школ..., 54 дзіцячыя дамы..., сілай завезена ў Германію 6080 чалавек мірнага насельніцтва..., разбураны клінскі музей Чайкоўскага, маёнтак Талстога...». Вось яны, будні 41-га, тое, што стаяла перад вачамі мастака, трывожыла яго сэрца і знайшло адбітак у творчасці — «Дом з палоннымі чырвонаармейцамі, спалены немцамі», «На ўскраіне вызваленай Калугі», «Мажайскі сабор, разбураны фашыстамі», драматычны па настрою «Пейзаж ваенных гадоў».

Але не толькі боль і гнеў у творах Л. Лейтмана таго часу. Аптымізмам і глыбокай верай у вялікі нераможны народ прасякнуты творы «Чырвоная Армія ўступае ў Валакаламск», «Вясна фрыца», «На абарончым рубяжы», «Дзернаванне агнявога пункта», «Начныя работы па аднаўленню завода». Не заўсёды бездакорныя па малюнку, кампазіцыі, яны, як правіла, яркія, жыццесцвярджальныя па колеру.

У ваенныя гады Лейтман быў інструктарам палітаддзела, начальнікам агітмашыны, афармляў франтавыя газеты і «баявыя лісткі», рабіў замалёўкі, праводзіў заняткі з членамі рэдкалегіі. У якасці карэспандэнта расказваў аб подзвігах воінаў Чырвонай Арміі, гераізме тылу. Праз некаторы час Л. Лейтман стварыў некалькі лістоў на гэтую тэму.

Рабочыя мэблевай фабрыкі не раз бачылі, як мастак робіць нейкія замалёўкі. Даведаўшыся, што Леў Мееравіч рыхтуецца да ўсесаюзнай выстаўкі, яны заставаліся пасля доўгай і нялёгкай змены і майстравалі яму ў падарунак рамкі для лістоў. Мастак зразумеў, што яго творчасць патрэбна была людзям. Таму і запомніў ён гэты нязначны эпізод назаўсёды.

Журы выстаўкі маскоўскіх мастакоў у дні Вялікай Айчыннай вайны (1942) адобрыла і прыняло ўсе 10 акварэляў Л. Лейтмана на тэму «Абарончыя збудаванні пад Масквой». Удзельнічае ў гэты час Л. Лейтман і ў выстаўцы твораў беларускіх мастакоў у Маскве (1941), і ў выстаўцы «Вялікая Айчынная вайна» (1942). Яго работы назаўсёды захавалі для нас непаўторнае дыханне тых суровых дзён. Адлюстроўваў мастак, як заўсёды, тое, што непасрэдна бачыў і перажываў. Палітчас на пляцоўцы, разбітая нямецкая тэхніка, тава-

Партрэт будаўніцы М. Кірпічковай

рышы-аднапалчане, самаадданая праца жанчын, узводзячых абарончыя збудаванні,— вось замалёўкі эцюднага характару, уласцівыя лістам Л. Лейтмана ваеннага перыяду. Нямногія з іх закончаны, але ўсе работы гэтага часу («Стажок», «Вёска Серада», «Чырвоныя дахі») прасякнуты абвостраным пачуццём пяшчоты і любві да Радзімы і не маглі аставіць раўнадушным гледача.

Праца мастака была ацэнена партыяй і ўрадам. Л. Лейтман быў узнагароджаны медалямі «За абарону Масквы» і «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў». Менавіта ў гэты цяжкі для Радзімы час, у 1942 г., мастак, адчуваючы непарыўную сувязь з народам, уступае ў партыю.

Адразу пасля вызвалення Беларусі ў жніўні 1944 г. Леў Мееравіч вяртаецца ў Мінск. Амаль усё, створанае мастаком да вайны, загінула. Засталіся толькі работы, якія былі на даваеннай выстаўцы ў Маскве, ды тры пейзажы з перадваеннай персанальнай выстаўкі ў Мінску. Знойдзеныя далёка за межамі Радзімы, яны захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным мастацкім музеі.

Ленінскі праспект

Скончылася вайна. Але ўспаміны аб грозных днях не давалі спакою мастаку. Думкамі пра тых, хто чакаў, спадзяваўся, верыў, навеяны пейзаж «Замяло», выкананы гуашшу і акварэллю на чырвоным фоне. Перад намі вёсачка ваенных гадоў з заснежанымі хатамі, намеценымі сумётамі, якая жыве ў трывозе і насцярожаным чаканні. Водгук вайны адчуваецца і ў адным з першых пасляваенных пейзажаў Л. Лейтмана «Мінская ўскраіна».

Разам з тым мастак з задавальненнем адлюстроўвае радасць мірнага жыцця. Зачараваннем, цішынёй, задуменнасцю, спакоем поўны адзін з самых выразных па настроі пейзажаў гэтага часу «Месячная ноч». У «Народным гулянні» алеі парку запоўнены ажыўленым людскім патокам, уперадзе якога — воін з дзяўчынкай на руках. Кусты зеляніны, вячэрнія агеньчыкі, яркае адзенне людзей прыдаюць твору святочнасць.

Мастак зноў спалучае творчую працу з выкладаннем. Л. Лейтман прымае ўдзел у стварэнні Мінскага мастацкага вучылішча: збірае педагогаў, абмяркоўвае з імі праграмы (Леў Мееравіч быў назначаны загадчыкам вучэбнай часткі).

У 1947 г. Мінскае мастацкае вучылішча прымае першых навучэнцаў. Памяшкання не было. Займаліся то ў маленькай школе на Лагойскім тракце, то ў падвале опернага тэатра. Трамваі не хадзілі, і немалады ўжо, 50-гадовы мастак у салдацкім шынялі, ботах праз увесь горад нёс у рэчавым мяшку ахапак дроў, каб разам з вучнямі ада-

грэць ля жалезнай круглай печкі, што стаяла ў кутку, фарбы, рукі.

Большая частка навучэнцаў — былыя воіны. Ды і педагогі амаль усе ваявалі. І вучні, і педагогі — І. Ахрэмчык, В. Цвірка, Н. Воранаў, С. Касмачоў, С. Каткоў, П. Крахалёў, Х. Ліўшыц, А. Луцэвіч, А. Малішэўскі — займаліся любімай справай з захапленнем, самаадданасцю. Жылі дружнай сям'ёй.

Мяккі і тактычны, дасціпны і жыццярадасны, сціплы і ўлюбёны ў маладых. Цярпліва, ашчадна і клапатліва дапамагаў кожнаму паверыць у свае магчымасці, максімальна выявіць свае здольнасці. Вучыў пісаць выразна, ярка («на шэры жывапіс так сумна глядзець»), раіў назіраць, быць уважлівым да жыцця («тады не давядзецца таптацца на месцы, паўтараць самога сябе»), напамінаў аб вялікай адказнасці, грамадзянскім абавязку мастака перад народам («асвойвайце спадчыну, максімальна ўзбагачайцеся, кажыце галоўнае, будзьце патрабавальнымі да сябе, хай заўсёды будзе зразумелым і значным тое, што вы хочаце сказаць людзям»). Часта паўтараў: «Галоўнае ў нашай рабоце — умець бачыць, выказваць убачанае і любіць людзей, жыццё».

Энтузіязм Л. Лейтмана-педагога адчуваецца і ў творчасці гэтага перыяду. Як заўсёды, ён шмат працуе. З асало-



Галоўны ўваход на стадыён «Дынама»

дай Л. Лейтман піша маслам вытанчаны, поўны настрою нацюрморт «Ружовыя півоні», выразныя жывапісныя «Партрэт дачкі», «Партрэт студэнткі». Зноў і зноў звяртаецца да беларускай прыроды. Спакойная, велічная, з бязвоблачнай велічэзнасцю неба паўстае яна ў «Цішыні», асветленая яркімі плямамі сонца — у «Дарозе на Каменку», па-левітанаўску сумная — у «Бярозках». Вобразны, невялікі па памерах ліст «Ля таполі Я. Купалы» пададзены ў срэбна-блакітнай танальнасці і здаецца нават манументальным дзякуючы цэласнасці жывапісна-пластычнага рашэння.

Бачачы, як паўстаюць з руінаў дамы, заводы, вуліцы Мінска, мастак спяшаецца адлюстраваць у сваіх творах усе этапы аднаўлення прамысловасці рэспублікі («Будаўніцтва галоўнага корпуса аўтазавода», «Мантаж станкоў на трактарным заводзе», «Ліцейны цэх аўтаматычных ліній»). Не ўсе гэтыя лісты ўдаліся мастаку, некаторыя з іх занадта сухаватыя па манеры выканання, не пазбаўлены схематызму. Асобным партрэтам і прамысловым пейзажам 50-х гадоў яўна не хапае індывідуальнасці. Яны носяць дакументальны характар. Але ёсць і іншыя.

Найбольш удалы з партрэтаў працаўнікоў — партрэт будаўніцы М. Кірпічковай. Ад дакладнага па малюнку ліста вее маладосцю, упэўненасцю, аптымізмам.

Алея

Галоўпаштамт

Паказваючы радасць мірных будняў, напружаны рытм аднаўлення, мастак імкнецца да каляровай разнастайнасці лістоў. Усё часцей у сваёй творчасці Л. М. Лейтман удзяляе ўвагу не толькі таму, што адлюстравана, але і таму, як гэта зроблена, перадае гармонію навакольнага свету, яго каларыстычную насычанасць.

У 50-я гг., адзначаныя шырокім горадабудаўніцтвам, мастак стварае серыю «Новыя абрысы гарадоў Беларусі». Сярод гарадскіх пейзажаў цэнтральнае месца ўдзелена новабудоўлям Мінска. Найбольш вядомыя лісты гэтага цыкла: лёгкі па жывапісе «Галоўпаштамт», шырока, манументальна паказаны «Ленінскі праспект», насычаны спакоем, прасторай, святлом «Галоўны ўваход на стадыён «Дынама».

У гэты ж час Л. Лейтман шмат увагі ўдзяляе пытанням гісторыі і тэорыі мастацтва. Ён актыўна выступае ў прэсе, узнімаючы шэраг актуальных праблем. Настойліва ставіць пытанне аб эстэтычным выхаванні гледача, праводзіць гутаркі з рабочымі, студэнтамі, вучнямі.

У 60—70-я гг. Л. Лейтман часта ездзіць па рэспубліцы. У гэтых паездках нараджаюцца новыя яго задумы і творы. Серыі работ, звязаныя з «Гомсельмашам», а таксама з індустрыяльным Мінскам — мотавелазаводам, аўтамабільным, трактарным, гадзіннікавым, заводам аўтаматычных ліній, адрозні-

ваюцца ад аналагічных лістоў Л. Лейтмана пасляваеннага перыяду. Мастак удала з'ядноўвае ў іх багаты творчы вопыт з юнацка ўсхваляваным успрыманнем свету, знаходзіць найбольш выразную форму. «Ліцейны цэх «Гомсельмаша», выкананы на кардоне соусам і гуашшу, каларыстычна аб'яднаны жоўта-чырвонымі ўспышкамі полымя. У «Зборачным цэху» дзякуючы спалучэнням яркіх чырвоных, сініх, жоўтых, зялёных тонаў ствараецца пачуццё напружанага працоўнага рытму. Энергічныя мазкі гуашшу і бяліламі ў лісце «Завод аўтаматычных ліній» дапамагаюць перадаць рух, жыццё.

Мастак застаецца верным сабе. Галоўным для яго з'яўляецца чалавек, які ўзгадняе дзеянні машын, падначальвае іх свайму розуму, пераўтварае прыроду, жывучы ў той жа час у згодзе з ёй. Гэтая думка выразна праглядваецца ў работах Л. Лейтмана «У кузні», «У зборачнай камбайнаў», «Ля такарна-карусельнага станка», у велічным цыкле «Культура і быт працоўных Завадскога раёна», у партрэтах працаўнікоў калгасных палёў, фабрык, заводаў. Для кожнага вобраза знойдзен у гэтых творах свой каляровы і кампазіцыйны лад.

Мастак не проста расказвае аб сваіх героях, ён акцэнтуе ўвагу на галоўным. Жывапісныя прыёмы абавязкова падпарадкаваны абрысоўцы характару. Падкрэсліваючы індывідуальныя рысы чалавека, Л. Лейтман выяўляе яго ўнутраны свет. Пазбаўляючы вобраз ад прамалінейнасці, спрошчанасці, стараецца выявіць шматграннасць, своеасаблівасць партрэтуемага. Партрэты Л. Лейтмана 60—70-х гг. гавораць аб яго вялікай назіральнасці, аб добрым разуменні чалавека і аб здольнасці мастака пераканаўча і проста расказаць аб ім гледачу.

У лаканічным партрэце «Бібліятэкар» увага сканцэнтравана на выразным сілуэце горда пастаўленай галавы, на непаўторнасці інтэлектуальнага, некалькі аскетычнага вобліку. Зусім іншы па настрою партрэт «Лабарантка». Перад намі — спакойны, мякка абрысаваны твар з лёгкім узлётам броваў, шыракаватым носам, вузкай лініяй верхняй губы. Партрэт настаўніцы («Першае верасня») выкананы ў карычнявата гаме. Л. Лейтман перадаў у гэтым канкрэтным і ў той

Вечар

Мост

Вясна



Вёска Серада

Чырвоныя стрэхі



У Палацы воднага спорту

жа час збіральным вобразе дабрату і строгасць, дзелавітасць і пяшчоту, урачыстасць і прастату. Усё ў ім ураўнаважана і гарманічна.

Шырокімі мазкамі, у яркіх чырвоных, бэзавых і зялёных тонах напісана «Будаўніца». У вобліку дзяўчыны жаноцкасць, прывабнасць, розум спалучаюцца з рашучасцю, сілай характару, незалежнасцю і мэтанакіраванасцю. Гэты індывідуальны і такі тыпічны да 60-х гг. вобраз — яўная ўдача мастака.

Да лепшых апошніх работ Л. Лейтмана можна аднесці і партрэт цялятніцы Н. Г. Берасцевіч. Яе дабрата, мяккі гумар, узнёсласць, шчырасць, любоў да сваёй справы — усё гэта было блізкім і дарагім мастаку і дапамагло ў рабоце над партрэтам. Выканаўшы партрэт на грунтаваным кардоне соусам і тушшу, мастак звяртае ўвагу гледача на светлую фактуру дрэва, сагрэты цеплынёй позірк дзяўчыны, тканіну, мяккую шэрсць цяляці. У гэтым лісце адчуваюцца і своеасаблівы почырк мастака, і яго шчырае захапленне чалавекам-працаўніком.

Асаблівую ўвагу ўдзяляў Л. Лейтман вобразам воінаў-пагранічнікаў, у якіх ён нярэдка бываў і якія, у сваю чаргу, прыязджалі на яго выстаўкі. Мужнасць, гатоўнасць да подзвігу — вось асноўнае ў героях гэтай тэматыкі. Сярод іх ветэран пагранічнай службы, старшына Н. І. Александрэнка з валявым характэрным тварам; малады пагранічнік, які напружана ўглядаецца ў да-

Ля таполі Янкі Купалы



Навальніца над паркам

лячынь («У дазоры»); мужная і стрыманая Надзежда Сурмач, якая не раз затрымлівала парушальнікаў граніцы; школьніца Люцына Шаблінская, член гуртка юных сяброў пагранічнікаў, узнагароджаная медалём «За адзнаку ў ахове дзяржаўных граніц СССР».

Ён выразна перадае мірную цішыню граніцы, адпачынак пасля вахты, цёплы охра-ружовы захад сонца ў «Вечары на граніцы». Стварае псіхалагічны шматгранны «Партрэт пагранічніка», у якім чытаюцца сціпласць, мужнасць, стрыманасць і жыццярадаснасць.

Мастак пераканаўча перадае не толькі стан чалавека, але і самыя разнастайныя «настроі» прыроды, рэчавага свету. Яго нацюрморты — гэта не злепак з натуры. Чалавек з багатым уяўленнем, надзвычай эмацыянальны, Л. Лейтман зрэдку насычае свае нацюрморты і пэўным сэнсавым зместам. Цікавыя ў гэтых адносінах яго шматлікія варыяцыі «Туалетны столік». Мастак то матэрыяльна, важка падае кожную рэч, як бы любуючыся ёю, то з артыстычнай лёгкасцю, ледзь прыкметна выяўляе ў прадмеце цікавыя каларыстычныя суадносіны. У некаторых нацюрмортах Л. Лейтман стварае прыцемкі, у якіх прадметы быццам растаюць, знікаюць, перадае фактуру

і форму рэчаў, насычаючы экспрэсіўнасцю ўвесь нацюрморт.

Але значна часцей мастак адлюстроўвае не рэчы, а кветкі, простыя палявыя і зграбныя садовыя. Нацюрморт захапляў мастака на працягу ўсяго творчага шляху. Як правіла, ён не піша дакладную копію кветкі, а стварае жывапісны вобраз, насычаны настроем, вырашаны цікава ў колеры. Імкліва выкананыя «Палявыя кветкі» быццам сагрэтыя сонцам, ахутаныя паветрам. Велічныя аксамітавыя гладыёлусы халаднаватыя. Ружовыя, бэзавыя флёксы пушыстыя, жыццярадасныя. Прыгожыя півоні ў сіняй вазе ўрачыстыя, а на садовай клумбе свежыя, быццам абмытыя дажджом. Асабліва тонкі па колеравамузырашэнню нацюрморт «Ружы», дзе лёгка, свабодна выступаюць найтанчэйшыя адценні ружовага.

Неяк Леў Мееравіч прызнаўся, што любіць, калі ў яго работах ёсць «вобразны намёк», які дае прастору супераживанням гледача. У значнай ступені такі намёк нясе ў сабе пейзаж «Перад навальніцай». Большая частка ліста запоўнена густой сінявой неба. Яркія бліскавіцы надыходзячай навальніцы, дзве постаці на пярэднім плане, густая зеляніна вялікіх дрэў, асляпляльная белізна балюстрады ствараюць напружанасць, усхваляванасць, надаюць малюнку драматызм. Гэты настрой падкрэсліваецца рэзка кантрастным каляровым гучаннем, дзе дамініруе халодны сіні колер.

Эцюд да аўтапартрэта

Партрэт цялятніцы М. Г. Берасцевіч

Кветкі на фоне акна

Усхваляванасць перададзена ў «Гарадскім матыве», хаця дасягаецца гэта іншымі сродкамі: неспакойны рытм малюнка воблакаў на вялікай прасторы неба паўтараецца ў хістаючайся зеляніне кустоў, ва ўсхваляванай лініі дамоў.

Неба, воблакі, водныя прасторы заўсёды зачароўвалі мастака. Дымчаты, шызаваты «Сож»; празрысты, бэзавы, вільготны «Летні дзень», у якім так удала па колеру аб'яднаны вада і неба; лёгкі, ледзь серабрысты туман у «Раніцы». Усё гэта стварае самыя розныя настроі. Аднак ва ўсіх аналагічных работах сказваецца даўняя прыхільнасць аўтара да няяркіх матываў, нягучных паэтычных інтанацый і празрыстасці, лёгкасці серабрыста-дымчатага каларыту.

Тым не менш у 60—70-х гг. усё больш з'яўляецца ў Лейтмана работ яркіх, насычаных па колеру. Зараз ён нярэдка імкнецца надаць сваім лістам гучнасць, мажорнасць. Ча-

сам Л. Лейтман свядома павышае эмацыянальнае гучанне колеру, не разбураючы рэальнай формы, а толькі максімальна выяўляючы характар малюнка («Асенні пейзаж»), насычаючы вобраз лірычным настроем (незвычайная, светлая і радасная «Ружовая раніца»).

Бясконца дарыў Л. Лейтману ўсё новыя і новыя сюжэты Мінск. Мастак імкнецца перадаць не проста «твар» горада, а яго «душу». У «Паркавай магістралі», напрыклад, выбіраючы пункт гледжання зверху, з вышыні птушынага палёту, ён стварае панарамную карціну, перадае абрыс маладога горада, поўнага зеляніны, святла, абагрэтага сонцам, ажыўленага рухам людзей і машын.

Узяўшы адну якую-небудзь тэму, мастак часта вар'іруе яе ў розных танальнасцях, пры розным асвятленні, кожны раз ствараючы новы настрой. Такія яго шматлікія, розныя па гучанні «вёсны», «зімы», «вечары», «світанні». У 1972 г. з'яўляюцца шматлікія разнастайныя па характары лісты Л. Лейтмана, дзе перададзена яркая, маляўнічая, хараводная палітра восені. У адным з пейзажаў абыграна ўсё багацце зялёнага колеру, у другім той жа зялёны сутыкнуўся з чырвоным, жоўтым, блакітным. «Люблю,— кажа мастак,— калі ліст, як музыка: мелодыя абуджае думкі, пачуцці».

Да такіх лістоў можна аднесці сугучны ясенінскай паэзіі, напоўнены ці-

Дзяўчына-штукатур



Туалетны столік

хім сумам перламутрава-блакітны пейзаж «Адгаманіў гай залаты» і спакойны, велічны, нават некалькі ўрачысты пейзаж «Асенняе маўчанне» з пакрытым шурпатай карой вялізным старым дрэвам на асенняй палянцы ды двума маладзенькімі танклявымі дрэўцамі і рэчкай удалечыні.

Па-свойму вырашана Л. Лейтманам серыя работ «Па ленінскіх месцах», якім уласцівы нягучныя, лірычныя, задушэўныя інтанацыі.

Праз чароўную прыроду ленінскіх мясцін мастак дае нам магчымасць акунуцца ў той час, калі Ленін працаваў і адпачываў тут. У гэтых творах адчуваецца непарыўная сувязь часоў, нябачная прысутнасць Ільіча ў нашым жыцці.

70-гадовы мастак блукаў па ленінскіх месцах, назіраў, разважаў, робячы натурныя замалёўкі. Яму ўвесь час здавалася, што Ленін зусім нядаўна любаваўся тут асеннімі фарбамі лістоты. Ленін любіў прыроду, і мастак спрабаваў уявіць сабе, якія пачуцці выклікаў у яго той ці іншы яе матыў. Гэтае адчуванне прысутнасці Леніна ўносіла ў яго работы асаблівы задушэўны настрой. Ён надаў чароўнасць дакументальна верагодным натурным замалёўкам, выкананым соусам. Дзякуючы майстэрству выканання і выразнасці настрою, яны маюць самастойную ка-

штоўнасць. І ў створаных ім потым акварэльных лістах («Дарога з Горак», «Месцы прагулак Леніна», «Любімая лаўка Ільіча» і інш.), кожны з якіх мае сваё рашэнне (моцная, важкая «Станцыя Ленінская», лёгкая, празрыстая «Альтанка»), мастак захоўвае агульны настрой.

60—70-я гг. характарызуюцца ў савецкім выяўленчым мастацтве павышанай увагай мастакоў да выразнай формы. Для Л. Лейтмана — гэта перыяд рашэння складаных кампазіцыйных і каларыстычных задач. Захоўваючы агульны лірычны настрой, яго работы цяпер носяць больш экспрэсіўны характар. Вопытны майстар, Лейтман не капіруе прыроду, часцей за ўсё піша па памяці (а памяць у яго была моцнай, вострай), карыстаючыся шматграннымі назіраннямі, алоўкавымі накідамі асобных матываў, запісамі колеру. Ён ніколі не разлучаецца са своеасаблівай запісной кніжкай-партсігарам з пакладзенымі ў яе лістамі паперы, на якія заносіць свае ўражанні, «заметкі». Калі ж малюе з натуры, то абагульнена, свабодна, імправізавана. Самая любімая тэхніка мастака — акварэль. Але звяртаецца ён і да гуашы, масла, соусу, тушы, вугалю, сепіі, сангіны. Яго захапляюць і пастэль («у ёй столькі цікаўнага»), і манатыпія («з ёй не заўсёды можна прадбачыць, што атрымаецца»).

У апошнія гады мастак пастаянна эксперыментуе. То піша на чырвонай

Будаўніца

Вуліца У. І. Леніна

паперы, дасягаючы асаблівай цеплыні колеру («Красавік»), то выкарыстоўвае стэарынавую аснову («Зімка», «Вечар»), то працуе соусам на грунтаваным кардоне («Завод аўтаматычных ліній»). То дабаўляе ў акварэль гліцэрын і мёд. То, паклаўшы паперу на фетр, б'е па ім малаточкам, пакуль на паперы не з'явяцца бугаркі. Потым працірае яе бакавой часткай свечкі, каб у гэтых месцах не клалася фарба. І правярае, як выглядае на гэтай паперы «Зімовы дзень».

Сакрэты сваіх знаходак Леў Меераві́ч старанна запісваў, збіраючы матэрыял для кнігі аб акварэлі. У яе павінны былі ўвайсці роздумы аб праблемах творчасці, пошуках свайго шляху ў мастацтве, аб узаемаадносінах традыцый і наватарства. «Традыцыі? У кожнага бачанне насычаецца не толькі жыццём, але і тым, што створана да яго іншымі. І гэта ўжо з памяці не выкінеш. Усё гэта ўкладваецца там, і, вядома, штосьці нейкім чынам потым аказвае ўплыў на цябе. Але каму цікава было б толькі пераказваць іншых ці паўтараць самога сябе? Мастацтва, як і ўсё астатняе, не стаіць на месцы, пастаянна асвойвае штосьці новае... Кожны, хто што-небудзь стварае ў ім, абавязкова раскрывае трошкі сябе. Гэта не нова. І калі ты ўжо індывідуальнасць, то гэта абавязкова будзе

бачна з тваіх твораў. Калі не, то хоць бокам пакажы ўсё, хоць уверх нагамі — здзівіць, спыніць гэта можа, але калі пустое — няма думкі, няма пачуццяў — усё роўна з цягам часу гэта стане бачна. Назаўсёды ашукаць нельга. Таму самыя першыя прэтэнзіі і патрабаванні павінны быць да сябе». У гэтым Л. М. Лейтман увесь — мастак, педагог, чалавек.

Сціплы і добразычлівы, Л. Лейтман скрозь усё жыццё пранёс цягу да людзей, цікаўнасць да жыцця, любоў да музыкі, паэзіі. Сярод акварэльных лістоў мастака нярэдка сустракаюцца лісты з яго вершамі, зрэдку сумнымі, часцей вясёлымі, з гумарам.

Невысокі, трохі сутулаваты, са старымі зморшчанымі танклявымі рукамі і жывымі, вясёлымі вачамі, з гаворкай, перасыпанай жартамі, добрым гумарам, мастак і ў 70 гадоў не ведаў спакою. Ён быў старшынёй графічнай секцыі Саюза мастакоў БССР, арганізатарам акварэльнай секцыі і трох рэспубліканскіх выставак акварэлі. Прымаў удзел у шэфскай рабоце Саюза мастакоў БССР. Льва Мееравіча пастаянна запрашалі то ў школы — расказаць рабятам аб сваёй рабоце, то ў Дом архітэктара — дапамагчы арганізаваць выстаўку акварэляў архітэктараў, на трактарны завод — на сустрэчу з самадзейнымі мастакамі. І

Любімая лаўка Ільіча

Л. М. Лейтман заўсёды ахвотна адгукаўся на гэтыя просьбы. Ён не любіў, калі ў яго запісной кніжцы, распісанай не толькі па днях, але і па гадзінах, заставалася пустое месца.

У 1967 г. Льву Мееравічу Лейтману было прысвоена званне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР. Творчасць яго знайшла шлях да гледачоў і не пакінула іх абыякавымі. За апошнія гады было арганізавана некалькі вялікіх персанальных выставак работ мастака. На адной з выставак у кнізе водгукаў запісана: «Паважаны Леў Мееравіч! На Вашай цудоўнай выстаўцы нават мне, чалавеку, не звязанаму непасрэдна з выяўленчым мастацтвам, было вельмі карысна пабываць. Я як бы з новага, незнаёмага боку ўбачыў даўно знаёмыя рэчы...». Гэта было тое, да чаго імкнуўся мастак.

20 верасня 1974 г. Льва Мееравіча не стала. Але людзям засталася творчасць мастака, шматлікія лісты — старонкі яго жыцця, якое цесна звязана з жыццём народа. Яны нярэдка з'яўляюцца на выстаўках, таму што назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю беларускага мастацтва.

Цяжка сказаць, які жанр, якая тэма ў творчасці Л. М. Лейтмана асноўныя. Пейзаж, партрэт, нацюрморт, працоўныя будні, ваенныя подзвігі? Галоўнае ў творчасці Льва Мееравіча Лейтмана — тое нявыдуманае жыццё, якое яго акружала і ў якім ён актыўна прымаў

Першага верасня



Пара цвіцення

удзел. Мастак выбіраў з гэтага жыцця ўсё, што заслугоўвала ўвагі: добрыя чалавечыя твары, пейзажы Віцебска, з якім былі звязаны яго першыя крокі ў мастацтва, светлыя цэхі заводаў, гераізм людзей у ваенныя гады, аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі, вуліцы новага, адбудаванага Мінска і бясконцыя беларускія прасторы, якія сталі вядучай мелодыяй у яго творчасці.

Заслуженный деятель искусств БССР Лев Меерович Лейтман вошел в историю белорусского советского искусства как тонкий лирик-акварелист и чуткий, влюбленный в свое дело педагог.

Почти полвека творческой и 30 лет педагогической деятельности на его трудовом счету. Творчество Л. Лейтмана развивалось в общем русле советского искусства. Оно отразило пути становления и развития нашего государства: славные будни строительства социализма, героический подвиг народа в годы Великой Отечественной войны, послевоенное восстановление страны, многогранную жизнь нашего современника.

Трудно сказать, какой жанр основной в творчестве Л. Лейтмана, хотя он и считается пейзажистом. Портрет, натюрморт, бытовые и батальные сюжеты — все, что было значительным и интересным в жизни, которая окружала художника и в которой он активно участвовал, нашло отражение в его работах.

Произведения Л. Лейтмана воспевают красоту советского человека, прелесть родного края. Различные по своему характеру, они всегда жизнерадостны и человеколюбивы, поэтичны и лиричны. Все это делает творчество Льва Мееровича Лейтмана гражданственным и гуманистическим, необходимым нашему современнику.

Leo Meyerovich Leitman, Honoured Art Worker of the Byelorussian SSR, has gone down in the history of Byelorussian Soviet art as a subtle lyrical painter of water-colours and a tender-hearted and considerate teacher wholly devoted to his work.

His career is that of about fifty years of creative work and thirty years of pedagoguism. Leitman's work has always been typical of the general course of development of Soviet art. He portrayed the process of formation and development of our State — the process of everyday socialist construction, the heroic deeds of the people in the post-war years and the country's present-day development.

It is difficult to say which of the genres is principal for the artist. Everything that has been of interest in the world around him, of which he has been an active maker, has been portrayed in his works — landscapes, portraits, still lifes, everyday-life and battle pieces.

Leo Leitman's works glorify the beauties of the Soviet people and the charms of the native land. Different in character, they are always full of gaiety, philanthropy, poetry and lyricism. They are imbued with civism and humanism and necessary for our contemporaries.

1929 г. Лос-Анджэлес
Выстаўка экслібрыса.

1930 г. Мінск
3-я Усебеларуская выстаўка.

1931 г. Мінск
4-я Усебеларуская выстаўка.

1932 г. Мінск
5-я Усебеларуская выстаўка.

1934 г. Мінск
Выстаўка «Мастакі БССР за 15 гадоў».

1935 г. Масква
Выстаўка беларускага мастацтва.

1937 г. Мінск
Выстаўка «БССР за 20 гадоў».

1938 г. Масква
Выстаўка выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі.

1938 г. Лондан
Выстаўка савецкай графікі.

1939 г. Масква
Усесаюзная мастацкая выстаўка «Індустрыя сацыялізма».

1939 г. Масква
Выстаўка выяўленчага мастацтва БССР.

1940 г. Нью-Йорк
Выстаўка савецкай графікі.

1940 г. Мінск
Усебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва

1940 г. Масква
Выстаўка выяўленчага мастацтва БССР.

1941 г. Мінск
Усебеларуская выстаўка твораў выяўленчага мастацтва.

1941 г. Масква
Выстаўка «Лепшыя творы савецкіх мастакоў».

ПЕРАЛІК АСНОЎНЫХ ВЫСТАВАК

1941 г. Мінск
Персанальная выстаўка твораў.

1942 г. Масква
Выстаўка «Творы маскоўскіх мастакоў у дні Вялікай Айчыннай вайны».

1942—1943 гг. Масква
Усесаюзная выстаўка «Вялікая Айчынная вайна».

1944 г. Масква
Выстаўка твораў мастакоў Беларусі, прысвечаная 25-годдзю БССР.

1945 г. Мінск
Выстаўка пейзажу.

1945 г. Мінск
Выстаўка твораў мастакоў Беларусі, прысвечаная 25-годдзю БССР.

1946 г. Мінск
Усебеларуская мастацкая выстаўка.

1946 г. Масква
Усесаюзная мастацкая выстаўка.

1947 г. Масква
Выстаўка, прысвечаная 30-годдзю СССР.

1948 г. Мінск
Выстаўка твораў беларускіх мастакоў, прысвечаная 30-годдзю Савецкай Арміі.

1949 г. Масква
Выстаўка твораў беларускіх мастакоў.

1950 г. Масква
Усесаюзная выстаўка мастацкіх твораў.

1951 г. Мінск
Усебеларуская выстаўка мастацкіх твораў.

1953 г. Мінск
Рэспубліканская мастацкая выстаўка.

1955 г. Масква
Выстаўка выяўленчага мастацтва і народнай творчасці БССР.

1956 г. Мінск
Персанальная выстаўка твораў.

1957 г. Мінск
Усебеларуская мастацкая выстаўка.

1958 г. Мінск
Выстаўка твораў беларускіх мастакоў, прысвечаная 40-годдзю Савецкай Арміі.

1959 г. Мінск
Усебеларуская мастацкая выстаўка, прысвечаная 40-годдзю БССР і Камуністычнай партыі Беларусі.

1960 г. Мінск
Рэспубліканская мастацкая выстаўка.

1961 г. Мінск
Рэспубліканская мастацкая выстаўка.

1962 г. Мінск
Рэспубліканская мастацкая выстаўка.

1963 г. Мінск
Рэспубліканская мастацкая выстаўка.

1964 г. Мінск
Выстаўка «Фізічная культура і спорт у выяўленчым мастацтве».

1965 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка «На варце міру».

1966 г. Мінск
Персанальная выстаўка, прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння.

1966 г. Мінск
1-я рэспубліканская выстаўка акварэлі.

1967 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка, прысвечаная 50-годдзю Кастрычніка.

1967 г. Мінск
Мастацкая выстаўка, прысвечаная 900-годдзю Мінска.

1968 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка «На варце міру».

1969 г. Мінск
2-я рэспубліканская выстаўка акварэлі.

1970 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

1971 г. Мінск
Персанальная выстаўка, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння.

1971 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка, прысвечаная XXIV з'езду КПСС і XXVII з'езду КПБ.

1972 г. Масква
Занальная выстаўка (БССР і Малдавія), прысвечаная 50-годдзю СССР.

1972 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка «СССР — наша Радзіма».

1972 г. Мінск
3-я рэспубліканская выстаўка акварэлі.

1973 г. Мінск
3-я рэспубліканская выстаўка «Фізкультура і спорт у выяўленчым мастацтве».

1973 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка «Ад з'езда да з'езда».

1974 г. Мінск
Рэспубліканская выстаўка, прысвечаная 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1975 г. Мінск
4-я рэспубліканская выстаўка акварэлі.

СПІС
ІЛЮСТРАЦЫЙ

Партрэт работніцы віцебскай фабрыкі «КІМ» Францэвіч. Папера, гуаш, 1937.
Пейзаж ваенных гадоў. Папера, акварэль, гуаш, 1943.
Зімні пейзаж 1943 г. Папера, акварэль, гуаш, 1943.
Зімні вечар. Папера, гуаш, 1945.
Старадаўняя альтанка. Папера, акварэль, гуаш, 1945.
Мінская ўскраіна. Папера, акварэль, гуаш. 1945.
Партрэт будаўніцы М. Кірпічковай. Папера, акварэль, гуаш, італьянскі аловак, 1951.
Ленінскі праспект. Папера, акварэль, гуаш, 1952.
Галоўны ўваход на стадыён «Дынама». Папера, акварэль, гуаш, 1952.
Алея. Папера, фламасцер, 1954.
Галоўпаштамт. Папера, акварэль, 1954.
Вечар. Папера, гуаш, 1930-я гг.
Мост. Папера, гуаш, 1934.
Вясна. Папера, акварэль, гуаш, 1939.
Вёска Серада. Папера, гуаш, 1943.
Чырвоныя стрэхі. Папера, акварэль, гуаш, 1943.
У Палацы воднага спорту. Папера, гуаш, 1971.

Ля таполі Янкі Купалы. Папера, гуаш, 1957.
Навальніца над паркам. Папера, акварэль, гуаш, 1958.
Эцюд да аўтапартрэта. Кардон, гуаш, соус, 1960.
Партрэт цялятніцы М. Г. Берасцевіч. Кардон, соус, туш, 1962.
Кветкі на фоне акна. Папера, манатыпія, італьянскі аловак, 1965.
Дзяўчына-штукатур. Папера, гуаш, соус, 1963.
Туалетны столік. Папера, акварэль, 1969.
Будаўніца. Папера, акварэль, 1970.
Вуліца У. І. Леніна. Папера, акварэль, 1970.
Любімая лаўка Ільіча. Папера, акварэль, 1970.
Першага верасня. Папера, акварэль, 1971.
Пара цвіцення. Папера, акварэль, 1973.

На вокладцы:
Дажджлівы дзень. Дзвіна. Кардон, гуаш, 1934.

СПИСОК
ИЛЛЮСТРАЦИЙ

Портрет работницы витебской фабрики «КИМ» Францевич. Бумага, гуашь, 1937.
Пейзаж военных лет. Бумага, акварель, гуашь, 1943.
Зимний пейзаж 1943 г. Бумага, акварель, гуашь, 1943.
Зимний вечер. Бумага, гуашь, 1945.
Старинная беседка. Бумага, акварель, гуашь, 1945.
Минская окраина. Бумага, акварель, гуашь, 1945.
Портрет строительницы М. Кирпичковой. Бумага, акварель, гуашь, итальянский карандаш, 1951.
Ленинский проспект. Бумага, акварель, гуашь, 1952.
Главный вход на стадион «Динамо». Бумага, акварель, гуашь, 1952.
Аллея. Бумага, фламастер, 1954.
Главпочтамт. Бумага, акварель, 1954.
Вечер. Бумага, гуашь, 1930-е гг.
Мост. Бумага, гуашь, 1934.
Весна. Бумага, акварель, гуашь, 1939.
Деревня Середа. Бумага, гуашь, 1943.
Красные крыши. Бумага, акварель, гуашь, 1943.
Во Дворце водного спорта. Бумага, гуашь. 1971.

У тополя Янки Купалы. Бумага, гуашь, 1957.
Гроза над парком. Бумага, акварель, гуашь, 1958.
Этюд к автопортрету. Картон, гуашь, соус, 1960.
Портрет телятницы М. Г. Берестевич. Картон, соус, тушь, 1962.
Цветы на фоне окна. Бумага, монотипия, итальянский карандаш, 1965.
Девушка-штукатур. Бумага, гуашь, соус, 1963.
Туалетный столик. Бумага, акварель, 1969.
Строительница. Бумага, акварель, 1970.
Улица В. И. Ленина. Бумага, акварель, 1970.
Любимая скамья Ильича. Бумага, акварель, 1970.
Первое сентября. Бумага, акварель, 1971.
Пора цветения. Бумага, акварель, 1973.

На обложке:
Дождливый день. Двина. Картон, гуашь, 1934.

Portrait of Frantsevich, a worker at the Vitebsk' KIM factory. Gouache on paper, 1937.
War-time landscape. Water-colours and gouache on paper, 1943.
Winter landscape. 1943. Water-colours and qouashe on paper, 1943.
Winter Evening. Gouache on paper, 1945.
An Old Summer-House. Water-colours and gouache on paper, 1945.
The Outskirts of Minsk. Water-colours and gouache on paper, 1945.
Portrait of the builder M. Kirpichkova. Water — colours, gouache and Italian pencil on paper, 1951.
Lenin Avenue. Water-colours and gouache on paper, 1952.
The Main Entrance To the Dynamo Stadium. Water-colours and gouache on paper, 1952.
An Alley. Pen on paper, 1954.
The Central Post Office. Water-colours on paper, 1954.
Evening. Gouache on paper, '30 s.
Bridge. Gouache on paper, 1934.
Spring. Water-colours and gouache on paper, 1939.
The Village of Sereda. Gouache on paper, 1943.
Red Roofs. Water-colours and gouache on paper, 1943.
In the Aquatics Centre. Gouache on paper, 1971.

REPRODUCTIONS

At Yanka Kupala's Poplar. Gouache on paper, 1957.
Park In Thunderstorm. Water-colours and gouache on paper, 1958.
A study of a self-portrait. Gouache on cardboard, 1960.
Portrait of the calf-breeder M. G. Berestevich. Ink on cardboard. 1962.
Flowers Against the Window. Italian pencil on paper, monotype, 1965.
A Girl Plasterer. Gouache on paper, 1963.
A Dressing-Table. Water-colours on paper, 1969.
Builder. Water-colours on paper, 1970.
Lenin Street. Water-colours on paper, 1970.
Ilyich's Favourite Bench. Water-colours on paper, 1970.
September 1st. Water-colours on paper, 1971.
The Time of Flowering. Water-colours on paper, 1973.

On the cover:
A Rainy Day. The River Dvina. Gouache on cardboard, 1934.

На белорусском языке

Эмилия Васильевна Арова

Рэдактар Г. П. Падбярэзскі
Мастак Л. Г. Мядзведзева
Мастацкі рэдактар Т. А. Мельянец
Тэхнічны рэдактар І. С. Шэршульскі
Карэктар Г. І. Славінская.

Лев Меерович Лейтман

АТ 09320. Здадзена ў набор 17/VI 1975 г. Падп. да друку 18/XII 1975 г. Тыраж 3000 экз. Фармат 70×90¹/₁₆. Папера мелав. Ум. друк. арк. 2,63. Ул.-выд. арк. 2,13. Зак. 2419. Цана 27 кап.

Выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Ленінскі праспект, 79.

Краткое резюме на русском и английском языках

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.